*Г. Ю. Емялёва, аспірант.*
*Навуковы кіраўнік – А. І. Смолік,*
*доктар культуралогіі, прафесар*

# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ЛЯЛЬКІ Ў СУЧАСНАЙ ВЯСКОВАЙ КУЛЬТУРЫ (па матэрыялах Кіраўскага і Клічаўскага раёнаў Магілёўскай вобласці)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Традыцыйную культуру Беларусі ХХ – пачатку ХХІ ст. закранулі значныя перамены – эканамічныя і палітычныя падзеі, сацыяльныя змены, што паўплывала на працэсы пераемнасці традыцыі, на фарміраванне сучаснага вясковага асяродка. Дзве сусветныя вайны і змена ладу жыцця пасля іх, масавы пераезд вясковага насельніцтва з вёскі ў горад, пашырэнне тэхнакратычнага светаўспрымання і адпаведнай дзейнасці, зніжэнне ў свядомасці выхадцаў з вёскі статусу традыцыйнай культуры і яе каштоўнасці, разрыў у працэсе пераемнасці традыцыйнай спадчыны прывялі да паступовага знікнення вёсак, а разам з ёй і традыцыйнай культуры ў жывым бытаванні. Там, дзе традыцыйная культура захоўваецца дзякуючы людзям сталага веку, больш маладыя жыхары вёскі і нават тыя, хто нарадзіўся пасля апошняй вайны, ужо з’яўляюцца іншым пакаленнем людзей, валодаюць меншым аб’ёмам і глыбінёй інфармацыі аб традыцыйнай культуры, часта маюць другую сістэму каштоўнасцей.

Да гэтага часу ў традыцыйнай культуры Беларусі і на сумежных тэрыторыях лялькі выкарыстоўваюцца як у абрадавай, так і ў пазаабрадавай дзейнасці. У якасці каляндарна-абрадавых лялек і іх семантычных аналагаў можна разглядаць антрапаморфныя артэфакты, зафіксаваныя ў розныя гады на Дабравешчанне [1,

с. 58], Ушэсце [2, с. 102], Сёмуху [2, с. 109–110], Купалле [3, с. 153; 4, с. 171–172], падчас дажынкавых абрадаў [5, с. 270; 6, с. 153], на Свячу [6, с. 95], св. Кузьму-Дзям’яна [2, с. 135], Каляды [7, с. 85], Масленку [3, с. 66–68] і інш. Сямейна-абрадавыя лялькі і іх аналагі маглі прысутнічаць у вясельным абрадзе перад вяселлем [8, с. 199], падчас выкупу нявесты [9, с. 625], пасля ад’езду маладой да маладога [10, с. 129], у маладога ў хаце за сталом [9, с. 526], перад клецццю [11, с. 24–25] і пасля клеці [9, с. 414], на перазоў [10, с. 129] і інш. Зафіксаваны звесткі аб выкарыстанні лялек у пахавальнай абраднасці, у аказіянальных абрадах (з мэтай выклікання дажджу, лячэння, варажбы).

Значна менш сабрана даследчыкамі інфармацыі аб беларускіх ляльках, што выкарыстоўваліся для дзіцячых гульняў. Гэта звязана ў першую чаргу з тым, што яны рабіліся з недаўгавечных падручных матэрыялаў. Па-другое, тэхналогіі стварэння лялек былі вельмі простымі, не скіраванымі на жорсткую фіксацыю матэрыялаў і канструкцыі, на доўгі тэрмін выкарыстання. Часта прыродныя і побытавыя аб’екты пераўтвараліся ў ляльку толькі на час гульні.

Вялікае значэнне для даследавання традыцыйных антрапаморфных артэфактаў мае іх канструкцыя. Л. С. Арлова, даследчыца традыцыйнай яраслаўскай, архангельскай і рускай паўночнай лялькі, адзначае, што лялькі, створаныя ў розных рэгіёнах, могуць быць знешне падобныя, але разам з тым вобразна і функцыянальна ўяўляюць розныя тыпы менавіта з-за сваёй унутранай пабудовы, якая, на думку даследчыцы, з’яўляецца больш архаічным за знешні выгляд фактарам [12, с. 49]. Трэба адзначыць, што форма і канструкцыя традыцыйнай лялькі звязаны як з тэхналогіяй і ўмовамі яе стварэння, так і са спецыфічнымі, унікальнымі ўласцівасцямі матэрыялаў, з якіх яна вырабляецца. І. А. Марозаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адзначае, што «ў шэрагу выпадкаў матэрыял, з якога зроблены антрапаморфныя фігуркі, наўпрост прадыктаваны абрадавай або гульнявой прагматыкай» [6, с. 44], якая, у сваю чаргу, «вымушае да спрашчэння формы і вывядзення па-за знакавую сутнасць антрапаморфнай фігуркі» [6, с. 44]. Акрамя таго, пры стварэнні лялькі мяжа паміж «прыродным» і «культурным» у ёй часта вельмі празрыстая, няўлоўная і дастаткова ўмоўная, а антрапамарфізм надаецца мінімальнымі знакавымі сродкамі, абазначаецца мінімальнымі маркерамі, уласцівымі пэўнай культуры. У якасці такіх прыёмаў І. А. Марозаў вылучае наданне аб’екту знешняга падабенства з чалавекам (з дапамогай дрэс-кода або пазначэння частак цела), прысвойванне яму імя, дзеянні з ім як з жывым чалавекам [6, с. 96].

Экспедыцыя, арганізаваная аўтарам артыкула ў жніўні 2011 г. у Клічаўскі і Кіраўскі раёны Магілёўскай вобласці, выявіла чатыры канструктыўныя тыпы лялек, якія выкарыстоўваліся ў дзіцячых гульнях. Першы, дастаткова пашыраны на тэрыторыі Беларусі тып лялькі – лялька-немаўля, якая ўяўляе скрутак тканіны з завязанай на галаве хусткай, замест тканіны для цела маглі выкарыстоўвацца кашуля, кофта. Такія лялькі зафіксаваны ў в. Лаззё і в. Вусце (в. Вусце цяпер далучана да в. Бацэвічы) Клічаўскага раёна, а таксама ў в. Кострычы Кіраўскага раёна. Паводле інфарматараў (Арэшка Соні Іванаўны, 1928 г. н., в. Бёрда, і Клабук Марыі Іванаўны, 1931 г.н., в. Лаззё), лялькі маглі быць і маленькія, і большыя, дзеці іх клалі спаць, калыхалі, самі спалі з імі, шылі лялькам адзенне. Рук і ног лялькам не рабілі, але часам маглі «начыркаць» твар (вочы, нос, рот), давалі імёны.

Другі тып лялек, зафіксаваны (ад Стаўбуновай Марыі Іванаўны, 1942 г. н., в. Заполле) у в. Заполле Клічаўскага раёна, – гэта лялька-немаўля, у аснове якой – крыж, што ўтвараецца з двух скруткаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тканіны большага і меншага памеру, перавязаных паміж сабой крыж-накрыж вяровачкай. Скрутак, які пазначае рукі, прыкладаецца да скрутка-цела спераду. Зверху на такую канструкцыю павязваецца хустка.

Трэці канструктыўны тып лялек зафіксаваны ў в. Кострычы Кіраўскага раёна ад жыхарак вёскі Казека Улляны Емяльянаўны, 1937 г. н., і Казека Улляны Дзянісаўны, 1926 г. н. Галоўны канструктыўны элемент гэтых лялек – галава, вакол якой накручвалі, навязвалі лапікі, якія і ўтваралі ўмоўнае тулава. Маглі прышываць рукі або замест іх завязвалі пад галавой кавалачак тканіны, два канцы якога і ўтваралі рукі. Лялькам шылі плаццейкі, рабілі косы з кудзелі. Дзеці ежу лялькам ставілі, кармілі, сям'ю рабілі (маці, бацьку, дзіцятка) і гралі «ў сям'ю». Лялькі гэтага тыпу па памерах амаль у два разы меншыя за папярэднія, робяцца даўжынёй прыкладна ў далонь. Таксама ў в. Кострычы зафіксаваны лялькі-немаўля першага тыпу: «Якую возьмеш сарочку дзіраваю, добрага ж не было, свойскае, з анучы возьмеш яе, скруціш, а тады хусту завяжаш, спавіеш віроўкаю – ну і лялька была наша. Да ў мяне во ўнук быў, хлопчык, дак я ўзяла з анучы зрабіла яму ляльку, яшчэ й луччэй тых куплёных, ды шчэ й узяла розавы, ды й вочы нарысавала» (Крэскавец Вольга Іосіфаўна, 1946 г. н., в. Кострычы).

Ад гэтага ж інфарматара са слоў запісаны расповед пра яшчэ адзін, больш пазнейшы, спосаб скручвання лялек, які можна вылучыць як чацвёрты канструктыўны тып: «Тады ўжо ў апошнюю вочарадзь неяк сталі рабіць (ляльку) з хусты. Так во круцілі, круцілі, круцілі хусту, два рагі – той круціць хусту і той круціць хусту, а тады ўжо анучу, перакладаеш, з естай стараны рукі, а з естай стараны ногі» (Крэскавец Вольга Іосіфаўна, 1946 г. н., в. Кострычы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, на тэрыторыі Кіраўскага і Клічаўскага раёнаў Магілёўскай вобласці падчас папярэдняга даследавання былі зафіксаваны чатыры канструктыўныя тыпы традыцыйных лялек, якія выкарыстоўваліся ў дзіцячых гульнях. У большасці яны супадаюць з канструкцыямі традыцыйных беларускіх абрадавых лялек. Антрапамарфізм зафіксаваных аб'ектаў праяўляецца ў наданні ім знешняга падабенства з чалавекам (абазначэнне частак цела, элементаў адзення, твару), прысвойванні імя, камунікацыі з лялькамі, як з людзьмі, менавіта з дапамогай гэтых дзеянняў аб'екты набываюць іншы статус у культуры, пераўвасабляюцца ў ляльку. У сучаснай вясковай культуры такія лялькі амаль не ўжываюцца, бо нават тыя дзеці, што яшчэ жывуць на вёсцы, аддаюць перавагу сучасным, крамным цацкам, але ў асобных выпадках, пры патрэбе, традыцыйныя лялькі яшчэ ствараюцца і выкарыстоўваюцца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


1. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 1. Магілёўскае Падняпроўе / [аўт.: В. І. Басько [і інш.] ; пад. рэд. Т. Б. Варфаламеевай]. – Мінск : Выш. шк., 2001. – 790 с.

2. *Кухаронак, Т. І.* Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 239 с.

3. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне / [аўт.: В. І. Басько [і інш.] ; пад. рэд. Т. Б. Варфаламеевай]. – Мінск : Выш. шк., 2004. – 910 с.

4. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе : у 2 кн. Кн. 1 / [аўт.: В. І. Басько [і інш.] ; пад. рэд. Т. Б. Варфаламеевай]. – Мінск : Выш. шк., 2008. – 559 с.

5. *Земляробчы* каляндар : абрады і звычаі / уклад., класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага ; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 429 с.

6. *Морозов, И. А.* Феномен куклы в традиционной и современной культуре / И. А. Морозов. – М. : Индрик, 2011. – 351 с.

7. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 5. Цэнтральная Беларусь : у 2 кн. Кн. 1 / [аўт.: В. І. Басько [і інш.] ; пад. рэд. Т. Б. Варфаламеевай]. – Мінск : Выш. шк., 2010. – 847 с.

8. *Гульні,* забавы, ігрышчы / [уклад., класіфікацыя і сістэматызацыя матэрыялаў, камент. і ўступ. арт. «Беларускія народныя гульні» А. Ю. Лозкі]. – 3-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 530 с.

9. *Вяселле.* Абрад / [рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.] ; музычны дадатак З. Я. Мажэйка]. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 682 с.

10. *Этнаграфія* Беларусі: энцыклапедыя / навук. канс.: М. В. Біч [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – (Беларуская савецкая энцыклапедыя).

11. *Народны* тэатр / [уклад. і камент. М. А. Каладзінскага ; уступ. арт. «Вытокі і эвалюцыя беларускага народнага тэатра» А. С. Фядосіка ; рэц.: Г. І. Барышаў, І. К. Цішчанка]. – 2-е выд., выпраўл. і дап. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 552 с.

12. *Орлова, Л. С.* Куклы и люди: о ярославских, архангельских и русских северных куклах из коллекции Л. Орловой и А. Найдена. – К. : Стилос, 2011. – 176 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ